# ЗМЕСТ

## да воп. № 2 (працяг) ф. 376


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА (ПРАЦЯГ) | | |
| 4. | ДАКУМЕНТЫ П.І. ВОЛЬПІНАЙ | 32-39 | |
| 5. | ДАКУМЕНТЫ Г.Р. ГЕРШТЭЙН | 40-41 | |

## Прадмова (працяг)

У выніку навукова-тэхнічнага апісання быў складзены вопіс № 2 (працяг) у колькасці 10 спраў (20 дакументаў) за 1945–1993, коп. за 1947 гады, якія паступілі ў БДАМЛМ у 1985–1998 гадах. Вопіс складаецца з 2 раздзелаў, сістэматызаваных па алфавіце прозвішчаў фондаўтваральнікаў, унутры раздзелаў – адпаведна прынятай у БДАМЛМ схемы.

Першы раздзел – дакументы **Вольпінай Песі Ісаакаўны** – актрысы Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР, якія паступілі ў БДАМЛМ ад яе самой у 1985 годзе. П.І. Вольпіна нарадзілася ў красавіку 1904 года ў сям'і шаўца ў Брэсце. У 1915 годзе разам з бацькамі эвакуіравалася ў Мінск, дзе ў 1916 годзе паступіла ў швейнае рамеснае вучылішча. У 1922 годзе як лепшая ўдзельніца [конкурсу] самадзейнага мастацтва была накіравана ў Дзяржаўную яўрэйскую драмстудыю ў Маскву. Па яе сканчэнні ў 1926 годзе была прынята актрысай у Дзяржаўны яўрэйскі тэатр БССР. У 1941 годзе разам з тэатрам была эвакуіравана на ст. Шахун'я Горкаўскай вобласці (цяпер – горад Шахун'я Ніжагародскай вобласці РСФСР), праз некалькі месяцаў – у Новасібірск (РСФСР). У жніўні 1946 года разам з трупай вярнулася ў Мінск, дзе працавала да закрыцця тэатра ў 1949 годзе.

Найбольш значныя ролі: Маці (“Рэкрут” паводле І. Аксенфельда, 1933), Валя (“У нашы дні” А. Вашэнцава, 1938), Голда (“Тэўе-малочнік” паводле Шолам-Алейхема, 1938), Жабрачка (“Помста” І. Левіна, 1943), Родл (“Музыка” Галкіна, 1944), Фрэйда (“Сіротка Хася” па п'есе Я. Гордзіна, 1944), Ханэ (“Паўстанне ў гета” Маркіша, 1944) і інш.

Узнагароджана Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР за асаблівыя заслугі ў галіне мастацтваў (1938) і медалём Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР за доблесную працу ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1946).

Раздзел прадстаўлены дакументамі П.І. Вольпінай (фота сцэн са спектакляў, яе асабістых дакументаў і дакументаў М.Х. Кагана, яе мужа). Сюды ўключаны копіі дакументаў П.І. Вольпінай з фонду Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР (БДАМЛМ, Ф. 222). Справы сістэматызаваны па відах дакументаў , унутры відаў – па храналогіі за 1945–1955, коп. за 1947 гг.

Другі раздзел – дакументы **Герштэйн Ганны Рыгораўны** – тэатразнаўцы, траюраднай пляменніцы Юдэля (Іегуды) Пэна, перададзеныя ёй самой у БДАМЛМ у 1998 годзе. Г.Р. Герштэйн нарадзілася 16 верасня 1923 года ў сям'і акцёраў Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР у Мінску. Падчас гастроляў тэатра ў Віцебску разам з бацькамі спынялася ў Ю. Пэна (на 6 месяцаў у верасні 1931 года, на некалькі месяцаў – у 1932, 1934 і 1936 гадах). Аўтар кнігі “Судьба одного театра: (о Государственном еврейском театре БССР)” (Мінск, 2000), успамінаў пра Юдэля Пэна і інш. Г.Р. Герштэйн памерла 20 красавіка 2019 года.

Раздзел складаецца з нарыса і ўспамінаў Г.Р. Герштэйн за 1993–1997 гг.

Прадмову склала  
заг. аддзела В.Ф. Шаталава  
11.02.2025

Установа "Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва"

ЗАЦВЕРЖАНА

Пратакол ЭМК БДАМЛМ
ад 19.02.2025
№ 2

ФОНД № 376
ВОПІС № 2 (працяг)
1945-1997, коп. за 1947

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **4. ДАКУМЕНТЫ П.І. ВОЛЬПІНАЙ** | | | | |
| | Дакументы П.І. Вольпінай | | | | |
| 32 | Фотаздымак сцэны са спектакля Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР "Сіротка Хася", пастаўленага рэжысёрам В.Я. Галаўчынерам па п'есе Я. Гордзіна, з удзелам П.І. Вольпінай (у ролі Фрэйды) і Э.Ю. Герцберг (у ролі Хасі) | [да 1949 г.] | 1 | 1 | |
| 33 | Фотаздымак сцэны са спектакля Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР "Тэўе-малочнік", пастаўленага рэжысерам М.Б. Сокалам паводле апавяданняў Шолам-Алейхема, з удзелам П.І. Вольпінай (у ролі Голды), Э.Х. Дрэйзінай [у ролі Бэйлкі] і М.Б. Сокала (у ролі Тэўе-малочніка) | [да 1949 г.] | 1 | 1 | |
| 34 | Фотаздымкі сцэн з неўстаноўленых спектакляў Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР з удзелам П.І. Вольпінай, [Ю.А. Арончык], К. Рутштэйна (Кулакова) і інш. | [да 1949 г.] | 3 | 3 | |
| | *** | | | | |
| 35 | Граматы выканкама Новасібірскага гарадскога савета дэпутатаў працоўных П.І. Вольпінай "за плённую працу ў Беларускім дзяржаўным яўрэйскім тэатры ў Новасібірску" і інш. | 1946 | 2 | 2 | |
| 36 | Дакументы актрысы Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР П.І. Вольпінай (асабісты лісток па ўліку кадраў, аўтабіяграфія, спіс выкананых у тэатры роляў і інш.).<br>Ксеракопіі | коп. за 1947 | 6 | 5 | |
| | *** | | | | |
| 37 | Фотаздымак [П.І. Вольпінай] у групе з неўстаноўленымі асобамі | [1950-я гг.] | 1 | 1 | |
| | Дакументы М.Х. Кагана (мужа) | | | | |
| 38 | Ганаровая грамата і граматы Вярхоўнага Савета БССР, Камітэта па справах мастацтваў пры СНК СССР і ЦК прафсаюзаў работнікаў мастацтваў | 1945-1955 | 4 | 4 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | СССР і інш. М.Х. Кагану (М.Я. Кагану) (мужу) за працу ў галіне культурнага шэфства над часткамі "Чырвонай Арміі, Ваенна-Марскога флота і войскамі НКВД", "за плённую працу ў Беларускім дзяржаўным яўрэйскім тэатры ў Новасібірску" і інш. | | | | |
| 39 | Фотаздымак сцэны з неўстаноўленага спектакля Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР з удзелам М.Х. Кагана (мужа), І.М. Левіна, А.Я. Трэпеля і М.А. Фрыдман | [да 1949 г.] | 1 | 1 | |
| | **5. ДАКУМЕНТЫ Г.Р. ГЕРШТЭЙН** | | | | |
| 40 | Г. Герштэйн. "Шляхі Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра Беларусі". Нарыс. Выразкі з часопіса "Тэатральная творчасць" №№ 2-4 за 1997 год | | 9 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 41 | Г. Герштейн. "Мои воспоминания". Успаміны пра Юдэля (Іегуду) Пэна. Аўтарызаваны машынапіс | 1993 | 9 | 1 | |

У дадзены раздзел вопісу № 2 (працяг) унесена 10 спраў (20 дакументаў) з № 32 па № 41, у тым ліку:
літарныя нумары
прапушчаныя нумары

Усяго ў вопіс уключана 41 справа з № 1 па № 41, у тым ліку:
літарныя нумары
прапушчаныя нумары

Вопіс склала і апрацоўку фонду зрабіла:
Загадчык аддзела ______________ В.Ф.Шаталава
15.05.2024

Дакументы прыняла:
Загадчык аддзела забеспячэння ______________ В.І. Бярэйшык
захаванасці дакументаў